Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

5 сакавіка 2016 года, № 3 (2150)

Фота Аляксандра СНАПКА

У нумары:

ДУМАЙЦЕ І НЕ ПАНІКУЙЦЕ!
Гутарка са старшынёй Асацыяцыі інвалідаў вайны ў Афганістане і выхавальнікам САК «Брыганціна» Сяргеем КРАСОЎСКІМ
Стар. 2

ЯК ПАЎПЛЫВАЛІ ПЛАТНЫЯ ПЕРАЗДАЧЫ НА ПАСПЯХОВАСЦЬ СТУДЭНТАЎ?
Падводзім вынікі зімовай сесіі разам з начальнікам ГУВНМР Людмілай ХУХЛЫНДЗІНАЙ
Стар. 3

СТУДЭНЦКІ ПРАФКАМ ПРАВЕРЫЎ КАРПУСЫ І СТАЛОВЫЯ БДУ
Прапановы былі абмеркаваны на сустрэчы з адказнымі асобамі ўніверсітэта
Стар. 4

І за вялікія грошы не купіш

Абнаўленне Дошкі гонару БДУ адбылося 23 лютага каля галоўнага корпуса

Ва ўрачыстай цырымоніі прынялі ўдзел рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, прадстаўнікі адміністрацыі, факультэтаў, выкладчыкі і студэнты.

Ужо шэсць гадоў на Дошку гонару заносяцца імёны і фатаграфіі супрацоўнікаў і навучэнцаў БДУ. Сёлета ўшанаваны 32 супрацоўнікі і 32 навучэнцы за заслугі і дасягненні ў адукацыйнай, навуковай, метадычнай, інавацыйнай, кіраўніцкай і спартыўнай дзейнасці па выніках 2015 г.

У асноўным, навучэнцы, якія трапляюць на Дошку гонару, – гэта студэнты апошніх (4–5 курсаў). Аднак ёсць і выключэнні. Напрыклад, **Улад Макарэвіч,** студэнт 3 курса спецыяльнасці эканамічная інфарматыка з эканамічнага факультэта.

Улад адзначаны за актыўны ўдзел у жыцці і факультэта і ўніверсітэта. Яшчэ ён добра вучыцца: сярэдні бал 9,8.

Ён прызнаецца, што вучоба ў БДУ – гэта цікава. «У цэлым, вучоба ў БДУ мне падабаецца, і я зрабіў правільны выбар, калі паступаў сюды. Яна дае магчымасці як у грамадскай, так і ў навуковай дзейнасці. Разумею, што адкрываю для сябе нешта новае з розных бакоў. Напрыклад, у навуцы я зацікавіўся тэмай інфармацыйнай бяспекі банкаўскіх сістэм. У будучыні быў бы рады працаваць як эканамістам, так і ў сферы IT-тэхналогій».

Студэнт таксама падзяліўся сваімі пачуццямі ад навіны.

«Калі ты на Дошцы гонару, то гэта значнае дасягненне. Я памятаю, што калі толькі прыйшоў падаваць дакументы ў БДУ, убачыў Дошку гонару і адразу сказаў маме, што абяцаю з'явіцца на ёй. Цяпер новае становішча мяне абавязвае. Ты робішся прыкладам для пераймання. І для абітурыентаў, якія прыйдуць паступаць і ўбачаць цябе. Даведаюцца, чым ты займаешся, і захочуць таксама, а можа, нават зрабіць больш».

Улад пажадаў усім студэнтам поспехаў у іх пачынаннях.

«Галоўнае, каб вашыя мары спраўджваліся. Бо калі ты сабе паставіў мэту, то трэба ісці да яе. Не азіраючыся ні на якія няўдачы».

Сярод супрацоўнікаў БДУ, якія трапілі ў гэтым годзе на Дошку гонару, ёсць дэканы факультэтаў, загадчыкі кафедраў, старшыя выкладчыкі.

Дзмітрый Ушакоў, дацэнт факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій – таксама ў гэтым шэрагу.

«Вельмі прыемна, што ўніверсітэт шануе не толькі студэнтаў, але і сваіх выкладчыкаў. Гэта цудоўная традыцыя: кожны год на гэтую дошку трапляюць годныя людзі. Я ва ўніверсітэце больш за 20 гадоў. І гэта належная ацэнка маёй дзейнасці».

Таксама Дзмітрый Уладзіміравіч пажадаў любіць сваю працу.

«Трэба працаваць на карысць універсітэта, на карысць краіны і рабіць сваю працу добра. Так, каб табой ганарыліся».

2015 быў адметны для БДУ адкрыццямі ў сферы біятэхналогій. Адзін са студэнтаў, **Валянцін Натараў,** пяцікурснік хімічнага факультэта, распавёў, што з'явіўся на Дошцы гонару за навучальную, даследчую працу і грамадскую дзейнасць.

«Тэматыка нашай кафедры ў асноўным сканцэнтравана на тэме бія- і нанатэхналогій. Напрыклад, прымяненне магнітных наначасціц для дыягностыкі і лячэння злаякасных пухлін. У прынцыпе, гэта адзін з прыярытэтных напрамкаў даследаванняў у сучасным свеце».

Валянцін распавёў, як успрыняў навіну аб занясенні на Дошку гонару.

«Нашы выкладчыкі, супрацоўнікі кафедры віншуюць мяне. Гэта вялікі гонар, бо, мабыць, толькі аднаму студэнту з усяго факультэта раз у год дастаецца такая ўзнагарода».

Валянцін плануе паступіць у магістратуру БДУ і працягваць уласныя даследаванні.

Рэктар БДУ акадэмік **Сяргей Абламейка** распавёў пра важнасць мерапрыемства.

«Падтрымка бывае розная: маральная і матэрыяльная. Калі мы шэсць гадоў таму адрадзілі Дошку гонару БДУ, людзям гэта вельмі спадабалася. Я ведаю, як факультэты змагаюцца за сваіх супрацоўнікаў і вылучаюць прапановы на Дошку гонару. Людзям вельмі прыемна бачыць свае фатаграфіі цэлы год у дворыку галоўнага корпуса. Іх бачаць усе. Гэта адна з формаў маральнага заахвочвання найлепшых людзей нашага ўніверсітэта. Акрамя таго, ёсць граматы, падзякі. А таксама званне заслужанага работніка БДУ. Добрая сістэма працуе».

Пабачыць усіх ушанаваных асоб можна і на сайце ***www.bsu.by*** ва ўкладцы *«Імі ганарыцца ўніверсітэт»*.

Фаіна НАКАНЕЧНАЯ

Весткі з рэктарата

КАЛЕКТЫЎ БДУ адзначаны граматай Міністэрства адукацыі за 2015 год у намінацыі «За найвышэйшыя пазіцыі ў міжнародных рэйтынгах універсітэтаў, павелічэнне аб'ёму фінансавання навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці на аднаго штатнага супрацоўніка».

* * *

ЗВАННЕМ «Заслужаны работнік БДУ» за шматгадовую добрасумленную працу і вялікі асабісты ўнёсак у развіццё БДУ ганараваны прафесар кафедры сацыялогіі ФФСН акадэмік ***Яўген Бабосаў*** і прафесар кафедры этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтва гістарычнага факультэта член-карэспандэнт НАН Беларусі ***Міхаіл Піліпенка***.

* * *

НДІ прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі БДУ споўнілася 45 гадоў! На ўрачыстым пасяджэнні 1 сакавіка навукоўцаў павіншавалі кіраўніцтва, дэканы факультэтаў БДУ, прадстаўнікі НАН Беларусі, Мінадукацыі, ВАК, ДКНТ і БРФФД.

* * *

ДЫПЛОМА першай ступені 55 Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі–2016» удастоены дапаможнік БДУ ***«Deutsch = Немецкая мова»*** ў намінацыі «Падручнік новага стагоддзя». Аўтары выдання – старшыя выкладчыкі кафедры нямецкай мовы ФСК *Александрына Зеляноўская*, *Святлана Трафіменка* і *Алена Фамянок*. Афармленне дапаможніка ажыццёўлена ўпраўленнем рэдакцыйна-выдавецкай работы, паліграфічнае выкананне – выдавецкім цэнтрам БДУ.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

Выхавальніка першай змены САК «Брыганціна» Сяргея КРАСОЎСКАГА добра ведаюць многія супрацоўнікі БДУ, дзеці якіх адпачываюць у летнім лагеры пад Радашковічамі. Між тым Сяргей Аляксандравіч мае шматлікія баявыя і дзяржаўныя ўзнагароды, з'яўляецца старшынёй Асацыяцыі інвалідаў вайны ў Афганістане, намеснікам старшыні Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане. Амаль 2-гадзінную гутарку з ім мы вырашылі падзяліць на тры часткі пад назвай **«Афганскі трыпціх»**. Газетная паласа дазваляе прывесці толькі некаторыя фрагменты гэтай займальнай размовы.



«Думайце і не панікуйце»!

Мірнае неба над галавою. Гэта вялікая, неверагодна значная ўмова чалавечага шчасця – і нават само шчасце для тых, хто ведае яму цану. Менавіта таму людзі, якія прайшлі ваенныя канфлікты, ведаюць пра гэта жыццё – ці, прынамсі, пра якіясьці яго аспекты – значна больш за іншых; на жаль, цана за такое веданне заўсёды вельмі вялікая.

– Сяргей Анатольевіч, як у Ваша жыццё прыйшла Афганская вайна? Вы патрапілі туды па прызыве або добраахвотнікам?

– Пачнём з таго, што гэта быў 84 год, і тады да вайсковай службы было зусім іншае стаўленне, чым цяпер. Сёння, калі ты пайшоў у армію, у грамадскай свядомасці гэта азначае, што цябе бацькі не «адмазалі», што ты, як той казаў, «лахануўся». А ў той час, калі ты не пайшоў туды, з табой, напрыклад, дзяўчаты – калі даведваліся, што ты не быў у войску, – па-іншаму размаўлялі. І наогул, у войска тады было ісці неяк ганарова. У 1984 годзе прыйшоў мой час выконваць свой воінскі абавязак. Я сам мінчанін, нарадзіўся і жыў у Фрунзенскім раёне – і 15 кастрычніка пайшоў у ваенкамат па месцы жыхарства. Туды з 6 закліканых чалавек прыйшло чацвёра, і атрымалася так, што з нас чацвярых толькі траіх пусцілі далей – аднаго «забракавалі» па зроку. Нас усіх траіх звалі Сяргеямі. І вось мы, тры Сяргеі, паехалі ўжо ў гарадскі ваенкамат, дзе ў аднаго з нас быў бацька-палкоўнік. Падышоў ён да сына, пагаварыў з ім – і гэты Сяргей кажа, што бацька пераводзіць яго ў іншую каманду, таму што мы ідзём у Афган...

...Мы ў Кушцы – паўднёвай кропцы Савецкага Саюза – сем дзён на цягніку ехалі. Размясціліся ў Іалатані ў навучальным падраздзяленні – і ўсё, пачалася служба. А служба тады – гэта не як у нас цяпер у Беларусі – снег прыбіраць і да т. п. У нас штодня былі стрэльбы, з раніцы была каманда «Рота, пад'ём, выходзь атрымліваць зброю» – і адпрацоўка «баявых». Вось ёсць фільм пра Афган, «9 рота», дзе персанажам далі раз стрэліць – і ўсё. Мы ж стралялі – кожны дзень з усяго ўзбраення. З кулямётаў, уключаючы КПВТ ад БТРаў, з гранатамётаў, былі начныя стрэльбы. Ручны кулямёт Калашнікава мне як родны, я яго насіў усюды з сабой. У Іалатані мы пазаймаліся дзесьці паўтара месяца, і нас адправілі ў горны навучальны цэнтр Келята ў Афганістане. Зусім у іншым баку. У Іалатані была раўніна, а Келята – гэта ўжо горна-навучальны цэнтр. Там пачалі лазіць па гарах, набываць навыкі альпінізму – ну і працягнулі таксама заняткі па стральбе. Рыхтавалі нас вельмі сур'ёзна...

...Цяпер моладзь не зразумее гэтага, зараз зусім іншы час, зусім па-іншаму людзі рэагуюць на інфармацыю пра войны, пра баявыя дзеянні. Тады гэта было па-іншаму – не рамантыка, але дакладна тое, чаго няма ў нас цяпер. Тым больш тут важна разумець, што «скарыць Афганістан» задачы не было. Мы гэта добра разумелі, і разумелі, што мы будзем дапамагаць афганцам. І мы сапраўды рабілі гэта – да той пары, пакуль Амерыка не ўзяла бен Ладэна і не дала яму грошай. Пакуль не стварылі ў Пакістане ваеннае падраздзяленне. Бо ўжо да 84 года, ды нават у канцы 83-га, асноўныя баявыя страты з таго боку ўжо складалі наёмнікі. Можна сказаць, што гэта была вайна з баевікамі. Па сутнасці, мы былі першыя, хто праводзіў антытэрарыстычныя дзеянні. Таму што пасля Афгана ўжо пайшлі вахабіты, пачалося нарастанне радыкалізму ў Чачні і г. д. Я лічу, што тое, што мы былі там, было правільным. Няправільна толькі тое, што мы выйшлі адтуль. Напэўна, нам трэба было заставацца і неяк больш грунтоўна вырашаць усе пытанні...

...Дык вось, на КамАЗе, з Хайратона, у суправаджэнні хлопцаў з аўтаматамі нас павезлі далей у Афган. Везлі нас у Кулі-Хумры. Мы ехалі, але ў нас саміх яшчэ не было ні ўзбраення, ні бронекамізэлек – нічога. Быў толькі рэчмяшок, у якім ляжала сапёрная лапатка, паёк – і ўсё. І вось мы заязджаем на горы – а недзе напарадзе пачалася стральба. Сяржанты, якія сядзелі з намі, скамандавалі «з машыны!», таму што ўжо пачуўся такі нарастаючы гул. Разумеючы, што ідзе абстрэл калоны, яны зрабілі правільна, што пачалі выводзіць салдат з машыны. Але народ-та неабстраляны быў у поўным сэнсе гэтага слова – і пападаў. Я, які сядзеў бліжэй да кабіны, устаў – але ўсе ж пападалі, што ж мне, бегчы па хлопцах, якія ляжаць? Ніяк. Спыніўся. Думаю, ну добра, пастраляюць, і ўсё будзе нармальна. Прылёг я, нават пачалі жарты чуцца, што во як, маўляў, яшчэ не даехалі, а ўжо па шляху «адграбаць».

І смяяліся мы да той пары, пакуль па тэнце машыны не прайшла аўтаматная чарга. Пасля гэтай чаргі і ўсмешкі, і ўсё астатняе знікла адразу ж. І было адзінае жаданне... Я вельмі спалохаўся! Але ўзяў свой рэчмяшок з сапёрнай лапаткай, паклаў паміж сабой і бортам – і схаваўся за ім. Я быў упэўнены, што яна, лапатка, мяне абароніць. Гэта было такое пачуццё, якое немагчыма апісаць. Абстрэл скончыўся, мы назад загрузіліся. Нас адчыталі – тых, хто не выскачыў: «Вунь машыны гараць, вы што, захацелі, каб вас пахавалі пад імі?» Па сутнасці справы, гэта быў першы такі выпадак, пасля якога я зразумеў, што гэта ўжо не жарты і тут ужо ўсё зусім па-іншаму – і стральба, і перажыванні.

...Вельмі шмат хто задае пытанне: «А хацеў бы ты цяпер у Афган?» Я адказваю канкрэтна: так, я хацеў бы. Але я не хацеў бы на вайну, я хацеў бы адчуць тое, чаго няма цяпер тут.

У Афгане не было масак, разумееш? Калі вось ты чалавек, салдат, і за месяц мы з табой паварыліся і ў баі і ва ўсім астатнім, то я ведаў, які ты. Там не было такога, што ў адным месцы нехта выглядае ўпэўнена, а тут раз – і «тое ягнятка» ўжо. Не, былі, вядома, моманты, калі хлопцаў мучылі прадчуванні, калі пацаны «губляліся». Але там усё было шчыра. Там не было нейкага, не ведаю, падману – не было такога, што табе маглі сказаць адно, а зрабіць іншае. Там, што гаварылі, тое і рабілі. Калі каманду давалі, ты выконваў. А вось цяпер нават сярод нашых хлопцаў бачу маскі. Хтосьці ў вочы кажа адно, а за вочы – іншае.

– Гэта значыць, нават сярод тых, хто ваяваў?

– Так, нават сярод тых, хто вярнуўся. І так непрыемна, калі хтосьці кажа адно, а робіць іншае. Сталі забываць вайну, цяпер ужо неяк менш успамінаў пра яе.

– А які менавіта тэрмін Вы там былі? З 84-га па 89-ы?

– Не, да 89-га там быў увесь кантынгент войскаў. Я праз год службы атрымаў цяжкае раненне, і мяне адправілі дадому.

...Адаптацыя была вельмі сур'ёзнай. Дапамагло тое, што я паступіў у наргас і адразу ж – хоць у мяне ўжо не было рукі, – адразу ж паехаў на бульбу з групай. І вось за час «бульбы» мяне хлопцы, дзяўчаты – у нас там больш дзяўчат было, юнакоў усяго трое – за гэты час яны неяк вярнулі мяне да жыцця – прычым хутка. Калі б я застаўся адзін, не паступіў у наргас і сядзеў у сценах – было б, напэўна, цяжка. А так яно ўсё пайшло, пайшло – і я рады гэтаму. Ну і самае галоўнае, што пасля першага курса, калі ўсе паехалі ў будатрады, я паехаў у дзіцячы лагер працаваць важатым. Хоць спецыяльнасцю маёй была рэвізія-кантроль у прамысловасці і дзецьмі там і не пахла, але я заўсёды любіў дзяцей, любіў заняткі з імі. І вось з 1986 года я кожны год летам езджу ў лагер працаваць. Вось ужо 14-ы год я езджу ў лагер БДУ «Брыганціна» і працую там на першым старэйшым атрадзе. Простым педагогам. Не нейкім там «старшым», начальнікам – а проста з дзецьмі.

– А што самае галоўнае ў выхаванні маладога пакалення? Што ім неабходна ўкласці, каб яны сапраўды разумелі гэта жыццё?

– Гэта цяжка сказаць, што трэба ўкласці. Я ім укладваю тое, што лічу больш важным. Калі была яшчэ першая сустрэча з атрадам, я сказаў ім: хлопцы, самае першае, самае галоўнае ў жыцці – гэта думаць не толькі пра сябе. Але акрамя таго, самае важнае, істотнае – гэта ніколі не панікаваць у любой сітуацыі і заставацца чалавекам. Пры пажарах, пры любой небяспецы: калі ты пачнеш панікаваць ці сыдзеш у сябе – ты прайграеш, або загінеш, ці яшчэ што-небудзь.

Адзін разумны чалавек неяк сказаў: на 40-ы дзень, стоячы на магіле сябра, сваяка, ты разумееш, што ты не можаш яго вярнуць. Ты больш нічога не можаш зрабіць. А астатняе – кінула дзяўчына, звольнілі з працы, дзесьці нехта патрапіў у аварыю – нішто ў параўнанні з гэтым. Усё астатняе можна перажыць. Не здаў сесію – ды гары яно гарам, значыць, і не трэба было. Або здасі ўсё роўна потым. Але вось памерлых ты не вернеш. А астатняе ўсё глупства. Калі б кожны разумеў гэта, я думаю, зусім па-іншаму людзі ставіліся б да сваіх няўдач і пераадольвалі цяжкасці больш рашуча. Але не ў кожнага гэта атрымліваецца. Я вельмі шмат успамінаю мінулае, ганаруся ім, шмат думаю пра будучыню, а вось жыць сучаснасцю ў мяне часта не атрымліваецца. Дакладней, атрымліваецца – толькі ў лагеры. Мне 51 год. А я ў душы адчуваю сябе дваццацігадовым. У плане таго, што я гатовы здзяйсняць такія ўчынкі, якія могуць рабіць толькі хлопцы.

– Так не кожны можа.

– Лагер дапамагае, дзеці дапамагаюць. Падсілкоўваешся нейкай энергіяй ад усяго гэтага. На працы калі пасля лагера з'яўляешся, кажуць: «Вось табе маеш, зноў ён на 5 гадоў памаладзеў, а то і на 10!» Гэта для мяне, як кажуць, і хобі, і жыццё, і ўсё ў адным флаконе.

...Вось была такая сітуацыя, каля лагера ехала машына на вялікай хуткасці, яе занесла, яна ўрэзалася ў агароджу і ўляцела на тэрыторыю лагера, дзе былі дзеці. Яна кулялася, перавярнулася, з бензабака бензін паліўся. А дзеці сталі, раты паразявалі. Я хутчэй адагнаў дзяцей, вельмі перажываў за іх. А Сашка Плаўрук адразу падбег да машыны, выламаў дзверы і пачаў выцягваць чалавека! Я падумаў: «Ё маё, я тут турбуюся за дзяцей, а нават у галаву не прыйшло, што там жа ёсць людзі і іх таксама трэба выратаваць».

– Скажыце, якія яшчэ рэчы Вас у жыцці радуюць, акрамя дзяцей? Ці ёсць у Вас у жыцці нейкае хобі, занятак – ці пастаянна ў працы?

– Ну, па-першае, 21 мая будзе 25 гадоў, як існуе Асацыяцыя інвалідаў вайны ў Афганістане, і ўжо 25 гадоў я старшыня гэтай арганізацыі. І гэта не хобі, гэта крэда жыцця. Я існую толькі за кошт таго, што прывык дапамагаць. Я не раблю сабе кар'еру, не зарабляю сабе такім чынам грошы: у мяне няма зарплаты ні ў Асацыяцыі інвалідаў, ні ў Беларускім саюзе ветэранаў вайны ў Афганістане, я працую бясплатна. Хоць у мяне ёсць сын, які скончыў БДУ, а цяпер працуе ў Акадэміі пры Прэзідэнце. І дачцэ 9 гадоў. Я павінен, вядома, забяспечыць сваю сям'ю, але павінен дапамагчы і сваім падапечным. Аднак не толькі ім, усім дапамагчы.

Гутарыў
Сяргей МАЕЎСКІ
Фота з асабістага архіва
Сяргея КРАСОЎСКАГА

Чытайце цалкам на gazeta.bsu.by

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Падводзім вынікі зімовай сесіі:

як паўплывалі платныя пераздачы на паспяховасць студэнтаў

Як вядома, перад зімовай сесіяй 2015/2016 у БДУ былі ўведзеныя платныя пераздачы залікаў і экзаменаў, што было ўспрынята не ўсімі студэнтамі з разуменнем. Цяпер узнікае натуральнае пытанне, ці дало гэта істотны эфект? Мы абмеркавалі вынікі сесіі з начальнікам Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы **Людмілай ХУХЛЫНДЗІНАЙ.**



Паспяховасць студэнтаў у зімовую сесію 2015/2016 навуч. г. павялічылася на 1,9% з папярэдняга года і склала 80,8%. Гэта самы высокі ўзровень за апошнія 5 гадоў

Лепей за ўсіх сесію здаў 5 курс – 88,1%, горш за ўсіх – трэці – 75,1%. Амаль на 0,19% выросла колькасць круглых выдатнікаў з адзнакамі 9 і 10 (6,6% ад агульнай колькасці студэнтаў, або недзе кожны 15-ы). З іншага боку, амаль у два разы паменшала круглых двоечнікаў, якія завалілі тры экзамены. Гэта 108 чалавек супраць 211 у папярэднім годзе. На пятым курсе ў мінулую і гэту зімовую сесію было менш за ўсё двоечнікаў (13 і 2 студэнты адпаведна), а максімальная іх колькасць на другім курсе (68 і 36).

Агульная паспяховасць першакурснікаў у БДУ складае 79,5%. Гэта значыць, што чатыры з пяці студэнтаў сваю першую сесію здалі. Але статыстыку значна сапсаваў біяфак, дзе амаль 40% першакурснікаў чамусьці праваліліся.

Студэнты-платнікі здалі экзамены на 1,5% лепей, чым год таму (70,7% супраць 69,2% узімку 2014/2015)

Людміла Міхайлаўна нагадала, што кіраўніцтва ўніверсітэта мусіла зрабіць адпаведныя захады ў адказ на тэндэнцыю да паніжэння паспяховасці студэнтаў. Па дадзеных ГУВНМР, узімку 2013/2014 навуч. г. паспяхова здалі сесію толькі 76,8% студэнтаў дзённай формы. Гэта значыць, праваліўся амаль кожны чацвёрты. Каб павысіць матывацыю студэнтаў і іх адказнасць да вучобы, кожны няздадзены залік ацанілі ў суму каля 35 тысяч, а экзамен – каля 50 тысяч рублёў. Дадзеныя кошты не вельмі значныя, але ўсё ж гэта спрацавала.

Самы паспяховы зноўку пяты курс – 81,4%. Складаней за ўсіх здаваць было платнікам першага курса 67,2%. Сярод студэнтаў платнай формы навучання ёсць і круглыя выдатнікі, па дадзеных з рэктарата, гэта 2,34% ад іх агульнай колькасці або адзін на 43 чалавекі.

Найбольшай паспяховасцю вылучаюцца студэнты журфака, ваенфака, хімфака і ФПМІ

Па гуманітарных факультэтах і інстытутах найбольш паспяхова здаюць сесію на факультэце журналістыкі – 87,9% (+8,1%). Можна падлічыць, што не шанцуе там толькі крыху больш, чым кожнаму дзясятаму. А вось у Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогій здалі без праблем толькі 74,9%, што тым не менш на 2,9% больш, чым у мінулую сесію.

Сярод факультэтаў і інстытутаў прыродазнаўчых і тэхнічных навук лідар – хімічны факультэт. Тут ажно 90,1% студэнтаў здалі сесію без запазычанняў. А навучэнцы ФПМІ паднялі гэты паказчык адразу на 6,9 пунктаў з 82,5 да 89,4%.

Яшчэ адной спецыфічнай рысай гэтай сесіі стала тое, што амаль усе студэнты цалкам атрымалі залікі перад сесіяй. Справа ў тым, што студэнт не дапускаўся да экзаменаў з неўкамплектаванай залікоўкай.

Рашэнне пра выкарыстанне грашовых сродкаў будзе прымацца разам са студэнцкімі арганізацыямі

Грошы, атрыманыя ад пераздач, пакуль што невялікія, бо ад увядзення новага парадку прайшло толькі два месяцы. Пытанне пра размеркаванне сродкаў ужо абмяркоўвалася на пашыраным пасяджэнні Студэнцкай асамблеі БДУ, у якім прынялі ўдзел рэктар Сяргей Абламейка і прадстаўнікі адміністрацыі нашага ўніверсітэта. Удзельнікі пацвердзілі, што грошы пойдуць выключна на адукацыйны працэс і што прапановы факультэтаў і студэнцкіх арганізацый стануць асновай пры прыняцці канчатковага рашэння.

Падрыхтаваў Віталь АРЭШКА

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: камп'ютарных тэхналогій і сістэм, шматпрацэсарных сістэм і сетак, нелінейнага аналізу і аналітычнай эканомікі, тэорыі функцый, генетыкі, электрахіміі, сацыялогіі, культуралогіі, камп'ютарный лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі, сацыяльнай камунікацыі, філасофіі культуры,

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай электронікі і нанатэхналогій, матэматычнай кібернетыкі, тэорыі функцый, тэарэтычнай і прыкладной механікі, замежнай літаратуры, сацыялогіі, аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі, культуралогіі, эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, банкаўскай эканомікі, рускай літаратуры,

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай інфарматыкі і атамна-малекулярнай фізікі, сістэмнага аналізу і камп'ютарнага мадэлявання, вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання, матэматычнай кібернетыкі, замежнай літаратуры, прыкладной лінгвістыкі, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, сучаснай беларускай мовы, тэорыі літаратуры, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, класічнай філалогіі, псіхалогіі, філасофіі і метадалогіі навукі, філасофіі культуры, аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі, банкаўскай эканомікі, міжнароднага менеджменту, эканамічнай тэорыі, інавацыйнага менеджменту, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, дыпламатычнай і консульскай службы, міжнародных адносін, міжнародных эканамічных адносін, міжнароднага права, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, перыядычнага друку, фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, эканамічнай геаграфіі замежных краін, крымінальнага права, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, дзяржаўнага кіравання, гісторыі новага і найноўшага часу, гісторыі Расіі, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, крыніцазнаўства, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў,

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, інфарматыкі і камп'ютарных сістэм, тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій, сістэмнага аналізу і камп'ютарнага мадэлявання, радыёфізікі і лічбавых медыятэхналогій, інтэлектуальных сістэм, вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання, заалогіі, арганічнай хіміі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, аналітычнай хіміі, замежнай літаратуры, раманскага мовазнаўства, этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтва, аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі, германскіх моў, міжнародных эканамічных адносін, раманскіх моў, інфармацыйных тэхналогій, нямецкай мовы, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, інжынернай геалогіі і геафізікі, дызайну, канстытуцыйнага права, паліталогіі, эканамічнай тэорыі, фізічнага выхавання і спорту, міжнароднага менеджменту, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, нямецкага мовазнаўства, прыкладной лінгвістыкі, рускай літаратуры,

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: замежнай літаратуры, аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі, экалогіі чалавека, камп'ютарный лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі, перыядычнага друку, дзяржаўнага кіравання, эканамічнай тэорыі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, англійскага мовазнаўства, кітайскай філалогіі,

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: шматпрацэсарных сістэм і сетак, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, камп'ютарных тэхналогій і сістэм, тэарэтычнай і прыкладной механікі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А. Д. САХАРАВА БДУ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ экалагічных інфармацыйных сістэм;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: экалагічнага маніторынгу і менеджменту, экалагічнай медыцыны і радыебіялогіі, экалагічнай і малекулярнай генетыкі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: біялогіі чалавека і экалогіі, кафедры фізічнага выхавання (2);

ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ замежных моў.

Адрас: 220070 г. Мінск вул. Даўгабродская, 23, аддзел кадраў, пакой 202, тэл. 230-16-95.

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

01 сакавіка Палякоў Аляксей Міхайлавіч, дацэнт кафедры псіхалогіі
04 сакавіка Казанцава Алена Анатольеўна, дацэнт кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства
05 сакавіка Ліхадзедаў Мікалай Аляксандравіч, прафесар кафедры вылічальнай матэматыкі
08 сакавіка Шчарбовіч Валянцін Антонавіч, дырэктар НТ РУП «Інкос» БДУ
10 сакавіка Шылін Андрэй Пятровіч, дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі
20 сакавіка Харын Аляксей Юр'евіч, дацэнт кафедры тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі
23 сакавіка Грушэцкая Зоя Яўгенаўна, дацэнт кафедры батанікі
27 сакавіка Белякова Людміла Пятроўна, дацэнт кафедры перыядычнага друку
28 сакавіка Налівайка Іна Міхайлаўна, дацэнт кафедры філасофіі культуры
29 сакавіка Чумак Анатоль Георгіевіч, загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл
29 сакавіка Камянкоў Віктар Сяргеевіч, загадчык кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці
29 сакавіка Лесніковіч Юлія Анатольеўна, дацэнт кафедры неарганічнай хіміі

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

На хімічным факультэце БДУ ўкаранёныя ўнікальныя для Беларусі інавацыйныя тэхналогіі адукацыі – лекцыйны падкастынг і відэалабараторныя працы – sputnik.by, kv.by (27.01), «Звязда» (30.01).

Электронная база рэзюмэ выпускнікоў-радыёфізікаў запушчана ў БДУ – interfax.by, БелТА, kv.by (01.02), minsknews.by, mgazeta.by (02.02), «Звязда» (04.02).

Фэст «Студэнцкія гульні БДУ–2016» – БелТА, sputnik.by, kv.by (08.02).

У БДУ на пасадзе дэкана факультэта філасофіі і сацыяльных навук зацверджаны кандыдат гістарычных навук Вадзім Гігін – naviny.by, sputnik.by, БелТА (02.02), БелаПАН (03.02).

Адкрыццё мінералагічнай выставы-кірмашу «Каменная казка» – minsknews.by (22.02), БелТА (23.02), БТ-1 (24.02).

Дзве каманды БДУ ўлетку запусцяць свае спадарожнікі CanSat – kv.by, БелТА, mediasat.info (11.02), belnovosti.by (12.02), БТ-1 (17.02), «Звязда» (27.02).

Грамадска-асветніцкая акцыя «Універсітэт – твой крок у будучыню–2016» стартавала ў БДУ – БелТА, «Мінск-ТБ» (18.02), Brsm.by (19.02).

Семінар «Руская мова як замежная ў ВНУ: новыя патрабаванні, падыходы, рашэнні» прайшоў у БДУ – edu.gov.by (15.02), soyuz.by, minsknews.by, blr.rcnk-rs.ru (16.02), ТРА «Саюз» (17.02), russianedu.ru, russkiymir.ru (18.02), ropryal.ru (20.02).

Міжнародны дзень роднай мовы ў БДУ – sputnik.by (15.02), postkomsg.com (16.02), БелаПАН (20.02), 21.by, sputnik.by (21.02), Мінск-ТБ (22.02).

У БДУ будуць рыхтаваць спецыялістаў па біяінфарматыцы – БелТА, aif.by, sputnik.by, interfax.by (10.02), kv.by, mir.pravo.by, slova.by (11.02).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

МАНІТОРЫНГ

Студэнцкі прафкам праверыў стан карпусоў і сталовых БДУ

18 лютага адбылася сустрэча студэнцкага прафсаюзнага актыву з прарэктарам па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце **Уладзімірам РАГАВІЦКІМ,** начальнікам Галоўнага гаспадарчага ўпраўлення **Аляксандрам КРЫШЧАНОВІЧАМ** і дырэктарам РВУП «Камбінат грамадскага харчавання» **Жаннай ВАРАНКЕВІЧ** па пытаннях стану і абсталявання навучальных карпусоў БДУ, працы пунктаў грамадскага харчавання (сталовых і буфетаў).

Уладзімір Рагавіцкі і Жанна Варанкевіч на сустрэчы са студэнцкім прафкамам

Прафсаюзнай арганізацыяй студэнтаў БДУ былі праведзены маніторынгі. Уважліва прааналізаваўшы ўсе вынікі, прафкам выйшаў на кіраўніцтва з пэўнымі заўвагамі, просьбамі і прапановамі па існых праблемах, прапануючы сумесна распрацаваць варыянты іх рашэнняў.

«Маніторынг па пытаннях стану і абсталявання навучальных карпусоў БДУ»

Ад факультэтаў прафсаюзнымі бюро студэнтаў былі прадстаўлены матэрыялы з канкрэтнымі выпадкамі і апісаннем праблем: стан і абсталяванне аўдыторый, прыбіральняў, тэмпературны рэжым і інш.

На сустрэчы прафсаюзныя лідары пазначылі пэўныя праблемы на факультэтах, такія як адсутнасць мыла і туалетнай паперы, наяўнасць люстэркаў, стан пліткі на падлозе, стан кранаў, дзвярэй і дзвярных ручак у прыбіральнях, стан разетак, аконных рам, столяў у аўдыторыях, стан тратуарнай пліткі па вул. Курчатава, 10 і іншыя. Дарэчы, шэраг праблем ужо вырашаны.

«Маніторынг па пытаннях працы сталовых і буфетаў БДУ»

У апытанні прынялі ўдзел каля 1400 студэнтаў розных факультэтаў БДУ, дзе навучэнцы маглі адказаць на пытанні анкеты, ацаніць і выказаць сваё меркаванне.

Па выніках апытання былі выяўлены частата наведвання сталовых і буфетаў, задаволенасць асартыментам першых і другіх страў, якасцю прыгатаваных страў, графікам працы пунктаў грамадскага харчавання, узроўнем коштаў і іншыя.

Па адказах рэспандэнтаў прафсаюзнай арганізацыяй былі занесены наступныя прапановы: разгледзець магчымасць арганізацыі працы асобных пунктаў грамадскага харчавання ў суботнія дні; супастаўленне графіка працы пунктаў з графікам працы факультэтаў; увядзенне комплексных абедаў; па магчымасці пашырэнне асартыменту за кошт гарніраў і дыетычных страў; увядзенне дадатковых кас падчас абедзенных перапынкаў на факультэтах і іншыя. Гэта дазволіць павялічыць колькасць наведнікаў і павысіць якасць абслугоўвання.

На сустрэчы адбыўся канструктыўны і карысны дыялог прафактыву і кіраўніцтва БДУ. Былі закрануты шматлікія іншыя пытанні і атрыманы кваліфікаваныя адказы. Практыка сустрэч у такім фармаце будзе працягнута.

Прафкам студэнтаў БДУ

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

Мова як лад жыцця

На мінулым тыдні Інстытут журналістыкі адзначыў Дзень роднай мовы. Студэнты асабліва любяць гэтае свята. Менавіта таму на працягу 24 лютага прайшло ажно 5 мерапрыемстваў! Амаль 8 гадзін журфак удзельнічаў у квэстах і гульнях, а напрыканцы хлопцы і дзяўчаты танчылі на вечарыне.

Разам з **Кірылам Карабанам,** адным з арганізатараў ДРМ, газета «Універсітэт» успомніла самыя лепшыя моманты.

Насамрэч, святкаванне Дня роднай мовы з'явілася і праходзіла яшчэ ў старым будынку, на вуліцы Маскоўскай. Аднак пакаленне за пакаленнем – і традыцыя перарвалася. Ідэя аднавіць яе прыйшла былой старасце факультэта Святлане Ісаёнак. З гэтага часу Дзень роднай мовы праходзіць у такім фармаце, як мы яго бачым зараз.

Мерапрыемства праводзіцца саветам старастаў журфака. За шэсць гадоў ДРМ стаў традыцыйным і палюбіўся кожнаму. Дзень пачынаецца з прыемнага: з самага ранку яшчэ заспаных студэнтаў і выкладчыкаў сустракаюць абдымкамі, часта пад музыку. Там жа яны атрымліваюць налепкі з нейкім сімвалам (сёлета гэта былі навушнікі).

Зусім новым, але файным праектам ДРМ–2016 стала ***агучванне вядомага ўсім серыяла «Сябры»***. Тры самыя смешныя серыі пераклалі на беларускую мову. Пераклад і агучванне рабілі самі студэнты журфака. Атрымалася вельмі цікава не толькі для гледачоў, але і для саміх арганізатараў. Эпізоды пазней з'явяцца ў сацыяльных сетках. Таксама ўпершыню прайшоў ***майстар-клас па стварэнні элементаў дэкору***, для чаго запрасілі крэатыўную беларускамоўную дзяўчыну – выпускніцу журфака Любоў Леановіч. Удзельнікі майстар-класа зрабілі драўляныя «домікі», якімі змогуць упрыгожыць свае пакоі, і засталіся задаволеныя.

«У дні беларускай культуры ўдзельнічаюць не толькі журфакаўцы, а нават работнікі сталовай: на працягу ўсяго дня там іграе беларуская музыка», – адзначае Кірыл.

Асаблівай папулярнасцю карыстаецца так званы ***«Лад жыцця»***. Выкладчыкі дзеляцца сваімі парадамі і расказваюць разнастайныя павучальныя гісторыі са свайго жыццёвага вопыту. Часам гэта шанец за гадзіну даведацца пра свайго настаўніка болей, чым за ўвесь перыяд навучання.

Ёсць яшчэ адна традыцыя, якая з'явілася толькі летась, але ўжо карыстаецца папулярнасцю сярод студэнтаў не толькі журфака. Гэта ***гульня «Мова як умова»***. На яе збіраюцца не толькі тыя, хто свабодна размаўляе па-беларуску, але і тыя, для каго слова «ажыны» – гэта нешта неверагоднае. А далей – усё па прынцыпе «хуткіх спатканняў»: за тры хвіліны беларускамоўныя спрабуюць разгаварыць іншых. І няхай гэта складана, пагутарыць наконт вандровак ці любімай ежы, але эмоцыі – не перадаць словамі!

Пасля абеду прыходзіць час для гульняў студэнтаў з выкладчыкамі. Звычайна гэта «Мафія» альбо ***«Капялюш»***. У сераду мы спыніліся на другой. Патрэбна было выявіць, хто мае большы слоўнікавы запас. Каманды Ганны Віктараўны Курэйчык і Юліі Мікалаеўны Лук'янюк больш за гадзіну змагаліся за перамогу і каштоўныя прызы.

Фінальнай кропкай цудоўнага дня стала любімая ўсімі ***вечарына***! Дранікі, квас ды смятана, танцы, песні – усё роднае, сваё, беларускае. Не абышлося без конкурсаў і спаборніцтваў за лепшае ўменне гаварыць скорагаворкі ці прыдумаць верш пра родную мову. Прыемным сюрпрызам аказаўся беларускі моладзевы *рок-гурт «Мутнае вока»*, які пазнаёміў са сваімі песнямі.

«Адметна, што падчас правядзення Дзён роднай мовы на журфаку змянілася ўжо тры пакаленні старастаў факультэта (Святлана Ісаёнак, Лізавета Хмель і я). Спадзяюся, што нашая факультэцкая традыцыя святкаваць Дзень роднай мовы будзе цікавай не толькі для журфакаўцаў, але і для ўсіх студэнтаў БДУ! А дранікамі абяцаем пачаставаць», – падагульняе Кірыл.

Таццяна МОРАВА

Беларускамоўны БДУ-квіз прайшоў на фестывалі «Студэнцкія гульні БДУ–2016»

Чалкам фестываль заняў два дні. 40 камандаў з удзельнікаў, не старэйшых за 24 гады, адказвалі на пытанні «Сваёй гульні», «Медыя-азбукі», «Гульні ў словы», «БДУ-квіза», «Эрудыт-квартэта» і «Што? Дзе? Калі?». І хоць большасць з секцый праходзіла па-руску, штогод на фестывалі знаходзіцца месца для блока на матчынай мове — «БДУ-квіза па-беларуску».

Гэты беларускамоўны этап фестывалю зроблены для таго, каб знаўцы паказвалі свае веды ў роднай мове, культуры і гісторыі. «БДУ-квіз» сёлета складаўся з васьмі частак. Удзельнікам трэба было адказаць на пытанні па апошніх навінах краіны і свету, узгадаць аўтараў слоў і кампазітараў беларускіх песень, пазнаць у твар беларускіх дзеячаў, як знакамітых, так і малавядомых. У гэтым годзе квіз дапоўніўся сярод іншага і відэатурам. У ім удзельнікам паказвалі без гуку буктрэйлеры з фестывалю мабільнага кіно Velcom, а знаўцы мусілі адказаць, па якой кнізе здымалі тое ці іншае відэа. Адказы прымаліся на папяровых бланках на «мове». Арганізатары заклікалі ўдзельнікаў разважаць над пытаннямі ў сваіх колах таксама па-беларуску, але нікога, зразумела, не прымушалі.

Першае месца заняла мінская каманда «Надта змянілася за лета». Таксама «пад узнагароду» трапілі «На світанку» (2-е месца) і «Рэперы» (3-е). Вынікі «БДУ-квіза па-беларуску» ўключаюцца ў агульны залік фестывалю. Акрамя яго існуе яшчэ залік толькі для камандаў БДУ. І ўжо па гэтых двух заліках дзве найлепшыя каманды атрымліваюць пропуск на студэнцкі чэмпіянат Беларусі па інтэлектуальных гульнях. Гэтым разам туды паедуць «Маеш рацыю» ад БДУ і «Капітан-Рамадан».

Віталь АРЭШКА

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

5 сакавіка 2016 года
Падпісана да друку 3.03.2016 г.
Зак. 70. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by